В. И. Вернадского, философская мысль призвана анализировать и синтезировать понятия науки, что необходимо для проведения глубоких исследований социальных процессов [2]. Осмысление и применение представленных философских принципов даёт возможность органически сочетать их с другими принципами социального познания – общенаучными и социально- научными, уяснить их специфику и механизм действия. Применение данных принципов познания поможет чётче выявить глубинные основания противоречивых социальных процессов, выкристаллизовать те, которые обеспечивают стабильность и устойчивость развития общества, придают ему должный динамизм и гарантии прогресса.

ЛИТЕРАТУРА

1. Великие преобразователи естествознания. И. Пригожин. XIV международные чтения. –Минск, 1998. С. 97.
2. Вернадский В. И. Философские мысли натуралиста. –М., 1998. С. 301.

УДК 378.02

В. А. Кузьміч, ст. выкладчык

## ПРЫЯРЫТЭТНАСЦЬ ВЫХАВАННЯ Ў СВЯТЛЕ НОВАЙ ПАРАДЫГМЫ АДУКАЦЫІ

Адукацыя – тая галіна, якая выклікае асаблівае хваляванне, бо ўсё ў грамадстве залежыць ад яе. Варта мець на ўвазе, што на змену раней усталяваным навучальным падыходам прыходзіць новая парадыгма адукацыі (канцэптуальныя падыходы, прынцыпы і спосабы яе арганізацыі і рэалізацыі), якая патрабуе замены мэтаў, метадаў, механізмаў, спосабаў адукацыі, а таксама прадметнай арганізацыі зместу навучання.

На ўсіх узроўнях адукацыя павінна развіваць у навучэнцаў свабоднае, незалежнае мысленне. Навучанне павінна стаць больш гуманным (немалаважная роля адводзіцца ў гэтым асобе выкладчыка), тэхнічнае і іншае спецыялізаванае навучанне павінна ў аднолькавай меры спалучацца з агульнай гуманітарнай адукацыяй.

Роля ўстаноў адукацыі — не ствараць бяздумных спецыялістаў, каб проста запоўніць месцы ў розных сектарах эканомікі, а мэтанакіравана развіваць індывідуальныя здольнасці навучэнцаў, рыхтаваць іх да жыцця людзьмі, здольнымі думаць, разважаць пра

больш шырокую сацыяльную, гістарычную і філасофскую значнасць іх прафесіі. Усе тыя, хто сёння сур'ёзна і глыбока займаецца навуковымі дысцыплінамі – ад хіміі да матэматыкі – павінны так ці інакш задумвацца аб асноўных чалавечых пытаннях, такіх, як сэнс жыцця, арганізацыя часу і прасторы, будова сусвету і месца чалавека ў ім. На ўсіх узроўнях адукацыйныя структуры павінны выхоўваць маладых людзей самастойнымі, актыўнымі грамадзянамі.

З улікам сучаснай сацыякультурнай сітуацыі вызначаюцца глабальныя і рэгіянальныя фактары, якія дэтэрмінуюць змены парадыгмы адукацыі. Так, сярод глабальных фактараў узрастае роля і значэнне сацыяльнай кваліфікацыі – уменне жыць і тварыць у пэўным прафесійным полі (культурна-тэхнічнай прасторы), сярод рэгіянальных – пераадоленне тэхнакратычнага светапогляду індустрыяльнай эпохі. Фарміруецца запыт на асобу, здольную да культурна-гістарычнага самавызначэння і творчасці, асобу духоўна багатую.

Рэспубліка Беларусь звязвае свае дзяржаўныя інтарэсы з рэалізацыяй новай адукацыйнай парадыгмы, што засведчана ў дакументах як унутрыдзяржаўнага, так і міжнароднага ўзроўняў (Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах).Урэшце, прынцыпы, агульныя мэты і задачы нацыянальнай сістэмы адукацыі былі дэклараваны на Міжнароднай канферэнцыі па адукацыі ў Жэневе (1998 г.) у Нацыянальным дакладзе Рэспублікі Беларусь.

Ва ўсіх згаданых дакументах прыярытэтнымі накірункамі выступаюць:

•адраджэнне нацыянальна-культурнай асновы адукацыі;

•арыентацыя адукацыі на выхаванне свабоднай творчай і маральнай асобы;

•умацаванне фізічнага і псіхічнага здароўя нацыі і чалавека;

•дэцэнтралізацыя; дэмакратызацыя і гуманізацыя адукацыі; узаемадзеянне адукацыі з навукай, вытворчасцю, сацыяльна-духоўнай сферай, рэгіяналізацыя адукацыі, эканамічная накіраванасць навучання і выхавання, інтэграцыя нацыянальнай сістэмы адукацыі ў сусветную адукацыйную прастору.

У рэчышчы дэмакратычных зрухаў вядзецца праца шматлікіх калектываў вучоных-педагогаў, псіхолагаў, метадыстаў нашай краіны. Канцэпцыя асобаснага падыходу, якая шырока распрацоўваецца беларускімі навукоўцамі, дапамагае па-новаму ўбачыць і

пераасэнсаваць ролю выкладчыка беларускай мовы ў выхаванні нашай моладзі. Як асноўнае, вылучаецца палажэнне аб тым, што чалавек — галоўная каштоўнасць дзяржавы, а дзяржава павінна забяспечыць умовы для развіцця разумовых здольнасцяў кожнага суб'екта навучальна-выхаваўчага працэсу. Родная мова на сучасным этапе развіцця грамадства і ёсць той грунтоўны стрыжань, які арганічна знітоўвае як выкладчыкаў, так і студэнтаў у іх сумеснай працы па ўдасканаленні і ўзаемаўзбагачэнні, бо з дапамогай роднага слова забяспечваецца засваенне ўсіх прадметаў навучання і культурная ідэнтыфікацыя асобы.

У адносінах да методыкі навучання мове ў савецкай педагагічнай традыцыі трывала замацаваўся лінгвацэнтрычны падыход, згодна з якім мова вывучалася як сістэма, а не сродак наладжвання мыслядзейнасці, накіраванай на авалоданне ведамі, жыццёвым вопытам, мовай і маўленнем. Адбываўся схаластычны падыход да моўнай адукацыі, сутнасць якога не ў фарміраванні высокакультурнай, інтэлектуальна развітой, творчай, камунікатыўна актыўнай асобы з індывідуальнай свядомасцю і прадуктыўным тыпам мыслення, а ў фарміраванні чалавека калектыўнага; у асноўным увага акцэнтавалася на арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці і веданні правіл граматыкі. Развіццё мовы абмяжоўвалася пісаннем пераказаў, сачыненняў па ўзору. Як вынік гэтаму — навучэнцы, валодаючы ведамі пра мову, не валодалі самой мовай. Цікавы і такі феномен: чалавек складана ўмее гаварыць, але не можа аформіць думку на пісьме або выдатна піша, ды не ўмее дасканала карыстацца вусным словам, асабліва перад аўдыторыяй. Сам чалавек пры такой методыцы выпадаў з поля зроку, бо метадысты не звязвалі фарміраванне чалавека, яго шчасце ў асабістым жыцці, поспехі ў пэўных відах дзейнасці з мовай у цэлым і суразмоўніцтве ў прыватнасці. Дрэнная мова, дрэннае маўленне непазбежна разбурае гуманістычны характар мыслення — аснову чалавечага існавання. Па сутнасці, ігнаравалася этыка — маўленчае камунікатыўнае ядро асобы.

Як у педагагічнай практыцы, так і ў асобных слаях грамадства не атрымаў належнага асэнсавання той відавочны факт, што мова не проста этнічная прымета, а асноўны элемент духоўнай культуры, фальклору, літаратуры, мастацтва, рэлігіі, філасофіі. Паўнацэннае вывучэнне мовы — гэта найперш выхаванне на духоўных каштоўнасцях народа. Яно накіравана на спасціжэнне праз моўную сістэму ўнікальнасці нацыянальнага мыслення (менталітэту) у яго

часавай, геаграфічнай вызначанасці і культурнай адметнасці. Навучанне мове набывае лінгвакраіназнаўчы характар і прадугледжвае паралельнае асэнсаванне граматычных з'яў і гісторыі, традыцый, духоўнай і матэрыяльна-бытавой культуры, прыроднага асяроддзя як сутнасць іх быцця незалежна ад таго, з якой культурай сябе ідэнтыфікуюць навучэнцы. Такое навучанне з'яўляецца працэсам індывідуальнай акультурацыі асобы. Выкладчык-філолаг не павінен абмяжоўвацца вузкімі моўнымі мэтамі. Калі мы і навучым студэнта гаварыць, але не будзе чаго сказаць, то каму патрэбна такое вучэнне? Мова ў гэтым сэнсе разглядаецца не проста як знакавая сістэма, а як выключнае культурна-гістарычнае асяроддзе. Яно ў сваю чаргу павінна прадугледжваць знаёмства з нацыянальна-культурнай адметнасцю, якая праяўляецца ў фанетыцы, лексіцы, пазнавальнай інфармацыі краіназнаўчага характару (пра аб'екты культуры, гісторыю, знакамітых людзей, нацыянальную міфалогію як своеасаблівым бачанні нашымі продкамі навакольнага свету (міфы, тапонімы, гідронімы), у гісторыі станаўлення беларускага пісьма і кнігадрукавання, у моўнай этыцы народа: не толькі ў ветлівых зваротах, але і ў паводзінах, учынках (як гаварыць, слухаць, рэагаваць, уключацца ў размову, выходзіць з яе, выказваць нязгоду ці адабрэнне). На ўсё гэта ў беларускай традыцыі існуюць адпаведныя моўныя сродкі і этычныя нормы паводзін.

Менавіта такі падыход, скіраваны на прыярытэтнасць выхавання, пакладзены ў аснову навучальна-выхаваўчай працы кафедры беларускай мовы. Мы разумеем, што выпускнік тэхнічнай ВНУ ў аднолькавай меры чалавек высокай культуры і спецыяліст-прафесіянал, які годна можа прадстаўляць свой край на любых інтэграцыйных накірунках. Усё, пра што згадвалася вышэй, знаходзіць адбітак у нашай працы. Гэта і ўдасканаленыя рабочыя праграмы з абавязковым уключэннем у іх вуснага маўлення рознай тэматычнай накіраванасці. Падрыхтаванае маўленне знаходзіць сваё замацаванне ў рэфератах, у творчых працах (радаводы). На базе лабараторыі створана міні-бібліятэка, у якой студэнты прывучаюцца да самастойнага пошуку, працы з навейшай літаратурай, рыхтуюць складаныя тэмы. У любы момант студэнты, аспіранты могуць атрымаць кансультацыю па тэме, а асноўная мэта вуснага маўлення — навучыць студэнта годна трымацца перад аўдыторыяй, аргументавана, прыгожа прадстаўляць сваю дзяржаву ў будучым на самым высокім узроўні.

З мэтай выяўлення фактараў матывацыі студэнтаў у навучальнай дзейнасці сумесна з псіхолагам Беларускага педуніверсітэта імя М. Танка Ірынай Лапіцкай праведзена дыягностыка па трох параметрах: 1) стыль навучання студэнтаў; 2) індывідуальныя спосабы навучання; 3) спосабы выкладання, паводле якіх вызначаецца эфектыўнасць розных формаў навучання. Была ахоплена вялікая колькасць студэнтаў (I-II курсы), матэрыялы дыягностыкі рыхтуюцца да друку, але галоўнае, што нашы студэнты аддаюць перавагу дэмакратычнаму стылю навучання з пэўнай доляй адказнасці, якую павінен мець студэнт. Перавага надавалася інтэрактыўным метадам, якія дазваляюць працаваць актыўна ўсім удзельнікам педагагічнага працэсу. Франтальная мадэль, якая напамінае «фабрычную», бо падобна па форме і па змесце на вытворчы канвеер, дзе галоўнае — рэпрадуктыўнасць педагога, колькасць ведаў яго навучэнцаў, а не арганізацыя творчага пазнавальнага ўзаемадзеяння, — не даспадобы нашым навучэнцам. Вывучыўшы запыты нашых студэнтаў, выкладчыкі кафедры ўзялі накірунак на ўвасабленне перадавых айчынных і замежных тэхналогій у працэс навучання і выхавання ў ВНУ. З гэтай мэтай было наладжана правядзенне метадалагічнага семінара «Інтэрактыўныя метады навучання і выхавання», распрацаваны дзве навуковыя тэмы «Мадэліраванне вучэбна-выхаваўчага працэсу на аснове інтэрактыўнага навучання студэнтаў тэхнічных ВНУ і яго навукова-метадычнае забеспячэнне», «Навуковы стыль мовы: водгук, рэцэнзія, анатацыя, рэферат, дыпломная работа» і на іх аснове — арыгінальныя праграмы з выкарыстаннем інтэрактыўных методык па гісторыі беларускай літаратурнай мовы і асновах культурнага маўлення і стылістыкі. Сапраўднай сваёй мэты працэс выхавання дасягне толькі тады, калі набудзе няспынны характар працы як на занятках, так і пасля іх.

Стала добрай традыцыяй уключэнне ў навучальны працэс тэматычна-музейных заняткаў (на базе музеяў г. Мінска), тэматычна-літаратурных сустрэч (С. Грахоўскі, Ул. Арлоў, В. Аколава, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, а таксама сустрэч з навукоўцамі Акадэміі навук (В. Чамярыцкі, Л. Салавей), іншых навучальных устаноў (Л. Акаловіч — пед. універсітэт, Л. Дзіцэвіч — універсітэт культуры і інш.).

З мэтай культурна-асветніцкага характару праводзяцца канферэнцыі, алімпіяды. Створаны студэнцкі клуб «Беларуская гасцёўня» і паэтычны клуб.

Заваявала папулярнасць і такая форма ўзаемадзеяння з навучэнцамі, як літаратурна-музычнае суразмоўніцтва пад рубрыкай «Лірычныя пятніцы ў тэхналагічным» (сустрэчы з пісьменнікамі, артыстамі, гісторыкамі, бардамі, музыкантамі і інш.). Такія сустрэчы спрыяюць плюралізму думак, выпрацоўцы ў студэнтаў уласнай жыццёвай пазіцыі, культуры дыскусій.

Цеснае супрацоўніцтва выкладчыкаў і студэнтаў пры правядзенні сумесных мерапрыемстваў (наведванне тэатраў, выстаў, музеяў, правядзенне вечарын у інтэрнатах, выпуск літаратурнага альманаха, дзе сабраны вершы выкладчыкаў і студэнтаў, святочныя і інтэрнацыянальныя вечарыны — усё гэта не толькі выхоўвае, але і збліжае выкладчыка і студэнта ў суб'ект-суб'ектных узаемаадносінах.

Такім чынам, нацыянальна арыентаваная адукацыя не паўстае на шляху навуковага прагрэсу, яна паказвае, што навуковыя веды — толькі частка зместу адукацыі, іншыя ж часткі павінны адлюстроўваць нацыянальны дух, гісторыю, усё, што надае асобе ўстойлівасць, годнасць і гордасць за сябе як прадстаўніка нацыі. І толькі спазнаўшы вартасць свайго народа і дзяржавы, асоба студэнта зможа паўнацэнна інтэгравацца ў сусветную культурна-адукацыйную прастору. Таму гуманістычнае выхаванне немагчыма без нацыянальнага стрыжня, хаця, натуральна, не павінна абмяжоўвацца і замыкацца толькі ў ім. «Да чалавецтва праз свой народ» — такі лейтматыў сённяшняй педагагічнай думкі вучоных свету. Да гэтага імкнемся і мы.

УДК 378.02

Н. Я. Савіцкая, ст. выкладчык

## БЕЛАРУСКАМОЎНАЕ ВЫКЛАДАННЕ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У ВНУ: СУЧАСНЫ СТАН, ЦЯЖКАСЦІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Беларускамоўнае выкладанне спецыяльных дысцыплін у ВНУ. Гэта гучыць нават экзатычна і нерэальна цяпер, у час моцнага адкату чарговай хвалі беларусізацыі, якая адбываецца пры ўмелым і вытанчаным, або непрыкрыта нахабным і лжывым кіраванні гэтым працэсам зверху. Пры ўмове адсутнасці нацыянальнага універсітэта і адметнасці нацыянальнай адукацыі ўвогуле ў незалежнай дзяржаве паўстае пытанне аб сапраўднай дзяржаўнай самастойнасці і аб прызнанні беларусаў як этнасу ва ўсім свеце. Гэта добра вядома пераважнай большасці насельнікаў Беларусі ад самых ніжэйшых